# СТАТУТ
# ЛІТАРАТУРНАЙ ПРЭМІІ ІМЯ КАРЛАСА ШЭРМАНА

**(далей па тэксце – Статут Прэміі)**

## І. ЛІТАРАТУРНАЯ ПРЭМІЯ ІМЯ КАРЛАСА ШЭРМАНА: АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Арганізатарамі прэміі імя Карласа Шэрмана (далей па тэксце – «Прэмія») з'яўляюцца рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Беларускі ПЭН-цэнтр» (далей па тэксце – «Беларускі ПЭН-цэнтр»), грамадскае аб'яднанне «Саюз беларускіх пісьменнікаў» (далей па тэксце – «Саюз беларускіх пісьменнікаў»), Мясцовы дабрачынны фонд «Вяртанне» (далей па тэксце – Мясцовы дабрачынны фонд «Вяртанне») (усе разам далей па тэксце – «Аргкамітэт Прэміі»). Аргкамітэт Прэміі ў сваёй дзейнасці кіруецца Статутам Прэміі і заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, якое датычыцца тэматыкі конкурсу Прэміі.

1.2. Мэты Прэміі:
1.2.1. вызначэнне найлепшых перакладаў кніг на беларускую мову;
1.2.2. падтрымка школы мастацкага перакладу ў Беларусі;
1.2.3. ушанаванне памяці выдатнага літаратурнага перакладчыка Карласа Шэрмана.

1.3. Прэмія прысуджаецца ў намінацыях “Пераклад прозы”, “Пераклад паэзіі”, “Пераклад дзіцячай кнігі” за мастацкія кнігі, перакладзеныя на беларускую мову і выдадзеныя ўпершыню ў папяровым ці электронным выглядзе ў годзе, што папярэднічае году намінацыі на гэтую прэмію.

1.3.1 Выдадзенай упершыню лічыцца кніга, палова і больш зместу якой апублікавана (у кнізе) упершыню.

1.4 У спрэчных выпадках наконт допуска кнігі па жанры і арыгінальнасці выдання каардынатар Прэміі можа звярнуцца да Журы прэміі, якое вырашыць, ці адпавядае кніга патрабаванням, прапісаным у Статуце.

1.5. Кніга, якая намінуецца на конкурс Прэміі, павінна быць выдадзеная ў папяровым або электронным варыянце паміж 1 студзеня і 31 снежня каляндарнага года, за які быў абвешчаны конкурс Прэміі. Калі кніга, якая намінуецца на конкурс Прэміі, выйшла паміж 1 студзеня і 31 снежня каляндарнага года, за які быў абвешчаны конкурс, але з нейкай прычыны не была пададзеная на Прэмію, то яна можа падавацца ў наступным каляндарным годзе.

1.6. Для ўдзелу ў конкурсе Прэміі адсутнічаюць абмежаванні для перакладчыкаў паводле ўзросту, грамадзянства, месца жыхарства і месца публікацыі твораў. Намінуюцца кнігі жывых перакладчыкаў.
Да ўдзелу ў конкурсе прымаюцца кнігі, у якіх адзін, два ці тры перакладчыкі. Калі ў кнігі больш за тры перакладчыкі, яна не прымаецца да ўдзелу ў прэміі. Калі ў кнізе два ці тры перакладчыкі, іх пераклады не ацэньваюцца асобна, Журы ацэньвае кнігу цалкам (то бок, працу ўсіх перакладчыкаў у сукупнасці).

1.7. Парадак рэалізацыі конкурсу Прэміі на бягучы год, працэдуры прыёму заявак, а таксама ўзнагароды пераможцам вызначаюцца Рэгламентам Прэміі, які зацвярджаецца Аргкамітэтам Прэміі, з'яўляецца *Дадаткам №1* да Статута і можа змяняцца на працягу правядзення конкурсу Прэміі.

## II. ЭТАПЫ ПРЭМІІ

2.1. Конкурс Прэміі складаецца з наступных этапаў:
Першы этап: прыём заявак і кніг на конкурс Прэміі;
Другі этап: публічнае абвяшчэнне Поўнага спісу кніг, прынятых да ўдзелу ў конкурсе Прэміі;
Трэці этап: публічнае абвяшчэнне Доўгага спісу конкурсу Прэміі
Чацвёрты этап: публічнае абвяшчэнне Кароткага спісу кніг-фіналістаў конкурсу Прэміі;
Пяты этап: абвяшчэнне і ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання лаўрэата/лаўрэатаў Прэміі.

2.2. З удзелу ў конкурсе Прэміі выключаюцца кнігі, перакладчыкамі якіх з’яўляюцца сябры Аргкамітэту, Каардынатар Прэміі і/ці асобы, якія маюць дачыненне да падліку галасоў.

2.2.1 Калі сябра Журы з’яўляецца **адным з** перакладчыкаў (ці рэдактарам) кнігі, кніга можа быць намінаваная, але гэты сябра Журы не прымае ўдзел у абмеркаванні дадзенай кнігі і галасаванні па ёй (гл. пункт 6.5). Кніга, адзіным перакладчыкам якой з’яўляецца сябра Журы, не прымаецца да намінацыі на прэмію.

2.3. Лаўрэаты Прэміі могуць удзельнічаць у якасці намінантаў у наступных сезонах Прэміі.

2.4. Заяўляць кнігі на конкурс Прэміі ўпаўнаважаныя:
а) выдавецтвы;
б) сябры Журы Прэміі;
в) чальцы Аргкамітэта Прэміі;
г) творчыя аб’яднанні, культурніцкія інстытуцыі, літаратурныя СМІ.

Форма і змест заяўкі на конкурс Прэміі, а таксама адрас, на які неабходна дасылаць заяўкі, вызначаны ў пп. 3,4,5 Рэгламенту.

2.5. Іншыя фізічныя і юрыдычныя асобы (у тым ліку самі перакладчыкі) могуць падаваць прапановы для падачы заявак у Аргкамітэт Прэміі. Аргкамітэт Прэміі можа адмовіць або прыняць прапанову і дазволіць падачу заяўкі на конкурс Прэміі ў адпаведнасці з п. 2.4. Статута і п. 3,4,5 Рэгламенту.

2.6. Кнігу, якая заяўленая да ўдзелу ў конкурсе Прэміі, можна выключыць з удзелу паводле жадання самога перакладчыка кнігі (усяго перакладчыцкага калектыву ці ягоных асобных чальцоў) на этапе Поўнага спісу. Для гэтага перакладчыку неабходна накіраваць пісьмовую просьбу на адрас Аргкамітэта прэміі. Калі кніга мае некалькі

перакладчыкаў і іх жаданні адносна ўдзелу/няўдзелу ў конкурсе Прэміі разыходзяцца, то рашэнне адносна ўдзелу/няўдзелу кнігі ў конкурсе Прэміі прымае Аргкамітэт.

2.7. У конкурсе можа ўдзельнічаць любая колькасць кніг аднаго перакладчыка.

2.8 Калі лаўрэатам прэміі становіцца кніга, у якой два ці тры перакладчыкі, узнагарода ўручаецца калектыву перакладчыкаў.

## III. АРГКАМІТЭТ ПРЭМІІ

3.1. Аргкамітэт Прэміі складаецца са старшыні Беларускага ПЭН-цэнтра, старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў (або з іншых прадстаўнікоў вышэйзгаданых арганізацый, дэлегаваных у Аргкамітэт) і прадстаўніка Мясцовага дабрачыннага Фонду “Вяртанне”.

3.2. Аргкамітэт Прэміі прызначае Каардынатара Прэміі – асобу, якая каардынуе працу Аргкамітэта Прэміі, Журы Прэміі і ўсяго прэміяльнага працэсу. У некаторых выпадках пасада і абавязкі Каардынатара могуць быць падзеленыя паміж некалькімі асобамі.

3.3. Каардынатар не мае права голасу пры выбары лаўрэатаў Прэміі. Абавязкі каардынатара Прэміі вызначаюцца *Дадаткам №2.*

3.4. Перад абвяшчэннем прыёму кніг на конкурс Аргкамітэт Прэміі зацвярджае Рэглaverage Прэміі на бягучы год.

3.5. Аргкамітэт Прэміі прымае рашэнні на падставе Статута Прэміі і Рэгламенту Прэміі на бягучы год. Па пытаннях, не ўрэгуляваных Статутам і Рэгламентам, Аргкамітэт Прэміі прымае рашэнні, кіруючыся прынцыпам слушнасці, характарам Прэміі і яе падставаў.

3.6. Склад Аргкамітэта можа пашырацца. Новых кандыдатаў у чальцы Аргкамітэта могуць прапаноўваць дзейныя сябры Аркамітэта. Новыя сябры прымаюцца толькі кансэнсусам.

3.7. Сяброўства арганізацыі ў Аргкамітэце можа быць прыпыненае па ўласным жаданні або ў выпадку абгрунтаванага рашэння Аргкамітэта (рашэнне аб гэтым прымаецца не менш чым ⅔ галасоў ад агульнага колькаснага складу Аргкамітэта).

3.8. Сябры Аргкамітэта абавязаныя захоўваць у таямніцы пытанні ходу пасяджэнняў і галасавання Журы.

## IV. ЖУРЫ ПРЭМІІ

4.1. Колькасць сябраў Журы Прэміі кожны год вызначаецца Аргкамітэтам Прэміі.

4.2. Сябры Журы Прэміі прызначаюцца Аргкамітэтам Прэміі.

4.3. Сябры Аргкамітэта Прэміі не маюць права абірацца ў Журы Прэміі.

4.4. Працу Журы Прэміі курыруе Каардынатар Прэміі ў шчыльнай супрацы з Аргкамітэтам Прэміі.

4.5. Сяброўства ў Журы Прэміі заканчваецца а) з уручэннем узнагароды, б) калі сябра Журы Прэміі не мае магчымасці выконваць свае абавязкі далей, в) у выніку парушэння Статута або Рэгламенту Прэміі, г) калі падае афіцыйную пісьмовую адмову на адрас Аргкамітэта Прэміі. У гэтым выпадку Аргкамітэт Прэміі можа прызначыць новага сябра Журы Прэміі.

## V. ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ СЯБРАЎ ЖУРЫ ПРЭМІІ

5.1. Сябры Журы Прэміі абавязаныя прачытаць усе кнігі, прынятыя да ўдзелу ў конкурсе Прэміі, і прысутнічаць на пасяджэннях Журы.

5.2. Прысутнасць сябраў Журы на пасяджэннях Журы ў абгрунтаваных выпадках можа адбывацца ў фармаце відэа- або аўдыяканферэнцый. Сябра Журы, які не мае магчымасці прыняць удзел у пасяджэнні, можа прадставіць Каардынатару пісьмова свае прапановы, у адпаведнасці з мэтай і прадметам дадзенага пасяджэння.

5.3. Кожны з сябраў Журы Прэміі абавязаны зацвердзіць Поўны, Доўгі і Кароткі спіс кніг, якія прэтэндуюць на Прэмію, лаўрэатаў Прэміі ў адпаведнасці з працэдурамі, прынятымі Статутам і Рэгламентам.

5.4. Сябры Журы абавязаныя захоўваць у таямніцы пытанні ходу пасяджэнняў, галасаванняў і абмеркаванняў. Сябры Журы абавязаныя захоўваць у таямніцы прынятыя падчас пасяджэнняў рашэнні да моманту іх афіцыйнага абвяшчэння.

5.5. Сябры Журы абавязаныя не перадаваць нікому перасланыя ім электронныя версіі кніг, пададзеных на Конкурс. Папяровыя кнігі, пададзеныя на конкурс Прэміі, з’яўляюцца ўласнасцю Аргкамітэта Прэміі.

5.6. Сябры Журы прымаюць рашэнні на пасяджэннях на падставе Статута Прэміі і Рэгламенту Прэміі на бягучы год.

5.7. Па пытаннях, не ўрэгуляваных Статутам і Рэгламентам, Журы прымае рашэнні згодна з уласным меркаваннем, кіруючыся прынцыпамі слушнасці, характарам прэміі і яе падставаў.

5.8. Абмеркаванні Журы Прэміі падчас пасяджэнняў і прынятыя рашэнні фіксуюцца ў пратаколах пасяджэнняў.

5.9. Для вырашэння спрэчных пытанняў сябры Журы Прэміі могуць ініцыяваць скліканне дадатковага пасяджэння Журы Прэміі і прадстаўнікоў Аргкамітэта Прэміі. За прыняцце рашэння пра дадатковае пасяджэнне павінна прагаласаваць мінімум 2 (два) сябры Журы Прэміі.

## VI. МЕХАНІЗМ ГАЛАСАВАННЯ І ВЫЗНАЧЭННЯ ЛАЎРЭАТАЎ

6.1. Журы прымае рашэнні на пасяджэннях таемным галасаваннем простай большасцю галасоў.

6.2. Сябры Журы галасуюць пісьмова, пазначаючы ў бюлетэні сваё імя.

6.3. Таямніца галасавання захоўваецца Каардынатарам Прэміі — адзіным, хто ведае пра выбар кожнага з сябраў Журы.

6.4. Бюлетэні за сябраў Журы, якія галасуюць дыстанцыйна, запаўняе Каардынатар, які павінен далучыць да бюлетэня раздрукаваны электронны ліст ці іншы дакумент, які пацвярджае выбар.

6.5 Калі сябра Журы з'яўляецца **адным з** перакладчыкаў (ці рэдактарам) кнігі, гэты сябра Журы не прымае ўдзел у абмеркаванні дадзенай кнігі і галасаванні па ёй, ягоныя творы ў кнізе не разглядаюцца ў конкурсе. Гэты сябра Журы не можа прэтэндаваць на ўзнагароду ў выпадку перамогі дадзенай кнігі.

**6.6. Механізм фармавання Доўгага спіса:**

6.6.1. Кожны сябра Журы абірае ад 6 (шасці) да 10 (дзесяці) кніг у кожнай намінацыі з Поўнага спіса намінаваных кніг. (у адпаведнасці з пунктам 1.3 Статута.

6.6.2. Кожная з кніг, абраных сябрам Журы, атрымлівае 1 (адзін) бал.

6.6.3. Кнігі, якія набралі больш за ўсё балаў, праходзяць у Доўгі спіс. Доўгі спіс павінен складацца з мінімум 6 (шасці) - максімум 10 (дзесяці) пазіцый.

6.6.4. Калі за месца ў Доўгім спісе спаборнічае некалькі кніг, па іх праводзіцца дадатковае галасаванне. Кожны з сябраў Журы мае 1 голас, які аддаецца за адну з кніг, што прэтэндуюць на месца ў Доўгім спісе.

6.6.5. Сябрам Журы не прадастаўляецца інфармацыя, колькі галасоў атрымала кожная з кніг, якая прайшла ў Доўгі спіс.

**6.7. Механізм фармавання Кароткага спіса:**

6.7.1. Кожны сябра Журы абірае 3 (тры) кнігі ў кожнай намінацыі з Доўгага спіса намінаваных кніг (у адпаведнасці з пунктам 1.3 Статута.

6.7.2. Кожная з кніг, абраных сябрам Журы, атрымлівае 1 (адзін) бал.

6.7.3. 3 (тры) кнігі, якія набралі больш за ўсё балаў, праходзяць у Кароткі спіс па кожнай з намінацыяў.

6.7.4. Калі за месца ў Кароткім спісе спаборнічае некалькі кніг, па іх праводзіцца дадатковае галасаванне. Кожны з сябраў Журы мае 1 голас, які аддаецца за адну з кніг, што прэтэндуюць на месца ў Кароткім спісе.

6.7.5. Сябрам Журы не прадастаўляецца інфармацыя, колькі галасоў атрымала кожная з кніг, якая прайшла ў Кароткі спіс.

**6.8. Механізм галасавання за пераможцу:**

6.8.1. Кожны сябра Журы абірае найлепшую кнігу з Кароткага спісу ў кожнай намінацыі.

6.8.2. Кожная з кніг, абраных сябрам Журы, атрымлівае 1 (адзін) бал.

6.8.3. Кніга, якая набрала найбольшую колькасць балаў, становіцца пераможцай у сваёй намінацыі.

6.8.4. У выпадку, калі за перамогу спаборнічае дзве або больш кніг, па іх праводзіцца дадатковае галасаванне. Кожны з сябраў Журы абірае найлепшую кнігу з тых, якія спаборнічаюць за перамогу, абраная кніга атрымлівае 1 (адзін) бал. Перамагае кніга, якая набрала найбольшую колькасць балаў.

6.9. Прэмія ўручаецца ў намінацыях “Пераклад прозы”, “Пераклад паэзіі”, “Пераклад дзіцячай кнігі”. У кожнай намінацыі пераможцам Прэміі можа быць толькі адзін перакладчык (перакладчыцкі калектыў) адной найлепшай кнігі. Паводле рашэння Журы ў адной альбо некалькіх намінацыях Прэмія можа не ўручацца (пераможца не вызначаецца).

6.10. Таямніца галасавання Журы раскрываецца каардынатарам Прэміі толькі Аргкамітэту Прэміі.

## VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

7.1. Змены ў Статут уносяцца і зацвярджаюцца Аргкамітэтам Прэміі. Статут пачынае дзейнічаць з даты зацвярджэння яго Аргкамітэтам Прэміі.

*ДАДАТАК №1*
*да Статута*
*Літаратурнай прэміі*
*імя Карласа Шэрмана*

**РЭГЛАМЕНТ ПРАВЯДЗЕННЯ**
**ЛІТАРАТУРНАЙ ПРЭМІІ ІМЯ КАРЛАСА ШЭРМАНА**
**Ў 2021 ГОДЗЕ**

1. Тэрміны правядзення паасобных этапаў Прэміі вызначаюцца цягам прэміяльнага сезону, інфармацыя пра тэрміны абвяшчаецца на сайце і ў сацсетках Беларускага ПЭН-цэнтра, Саюза беларускіх пісьменнікаў і распаўсюджваецца сярод СМІ.

2. У кожнай намінацыі: "Пераклад прозы", "Пераклад паэзіі", "Пераклад дзіцячай кнігі" - лаўрэаты Літаратурнай прэміі імя Карласа Шэрмана (далей па тэксце – «Прэмія») атрымліваюць грашовую ўзнагароду ад Мясцовага дабрачыннага фонда "Вяртанне". Сума ўзнагароды вызначаецца штогод і агучваецца публічна ў рэлізах СМІ і на сайтах арганізацый, якія ўваходзяць у Аргкамітэт Прэміі.

3. Заяўка на Прэмію павінна ўтрымліваць наступныя звесткі і матэрыялы:
3.1. інфармацыя пра намінатара, што вылучае кнігу на Прэмію: імя, прозвішча ці назва арганізацыі, кантактныя нумары тэлефонаў, e-mail;
3.2. кантактны нумар тэлефону, e-mail перакладчыка (або кожнага з калектыву перакладчыкаў);
3.3. поўная назва, анатацыя, выдавецтва, месца, год выдання і ISBN кнігі;
3.4. кніга ў электроннай версіі і ад 2 да 5 папяровых асобнікаў кнігі;
3.4.1 **калі падача электроннага варыянта перакладзенай кнігі немагчымая, намінатар павінен прадаставіць не менш за 4 (чатыры) папяровыя асобнікі кнігі;**
3.5. выява вокладкі кнігі ў электроннай версіі (у фармаце JPEG);
3.6. намінацыю, на конкурс у якой падаецца кніга (рашэннем сябраў Журы намінацыя можа быць змененая).

4. Заяўкі на конкурс Прэміі неабходна дасылаць:
а) запаўняючы гугл-форму, спасылка на якую будзе змешчаная ў інфармацыі пра абвяшчэнне Прэміі
б) электронныя асобнікі кніг і выявы вокладак павінны быць дасланыя на адрас электроннай пошты konkurs.pierakladau@gmail.com, з пазнакай *"імя і прозвішча перакладчыка, назва кнігі";*
в) папяровыя асобнікі кніг неабходна перадаць у Беларускі ПЭН-цэнтр (вы можаце дамовіцца на сустрэчу, напісаўшы на адрас konkurs.pierakladau@gmail.com);
5. Тэрмін прыняцця заявак заканчваецца датай, вызначанай у інфармацыі пра абвяшчэнне Прэміі. У абгрунтаваных выпадках тэрмін прыняцця заявак можа быць працягнуты. На вызначаную дату (да 23:59 па беларускім часе) усе заяўкі мусяць быць атрыманыя Аргкамітэтам Прэміі. Няпоўныя заяўкі і заяўкі, якія паступяць пазней за гэтую дату, прымацца да ўдзелу ў конкурсе Прэміі не будуць.

6. Кнігі, атрыманыя для намінавання на Прэмію, не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.